— А что вы, Николай Федорович, везли в Эквадор в качестве сувенира?

— Жене Клаудио Марии — льняную скатерть с салфетками как воспоминание о родине. Купил набор как раз во время "Славянского базара" в Витебске". И еще деревянное панно с зубром. А для Клаудио — молдавский коньяк, который он еще в Минске полюбил.

Елена МОЛОЧКО.

ПУЛЬС

Сяляне пагражаюць байкотам

Жыхары вёскі Стаўры Аршанскага раёна напісалі адкрыты ліст прэзідэнту, у якім заявілі, што збіраюцца байкатаваць выбары, бо "страцілі давер да ўлады".

"У нашай вёсцы на месцы ліквідаванай фермы і на прылеглай тэрыторыі зямля не апрацоўваецца. На працягу пяці гадоў плошчы, што зарастаюць быльнягом (а гэта ўжо 2,5 га), толькі павялічваюцца.

У вёсцы, у якой пражывае 41 пенсіянер, адсутнічаюць пад'язныя шляхі да дамоў. На працягу чатырох гадоў Бабініцкі сельсавет і Аршанскі райвыканкам не выконваюць свае абавязкі, а менавіта не ліквідуюць аварыйныя дрэвы, што можа прывесці да трагічных наступстваў.

У сувязі з вышэйвыкладзеным наш давер да мясцовай улады і дэпутатаў усіх узроўняў у апошні час згублены. Калі ў бліжэйшы час нашы праблемы, якія павінна вырашаць мясцовая ўлада, не будуць вырашаны, мы не бачым мэтазгоднасці ўдзелу ў маючых адбыцца выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь", — гаворыцца ў звароце вяскоўцаў на імя Аляксандра Лукашэнкі.

Не бульбай адзінай

Агульнабеларуская выстава-кірмаш вінаградараў, пчаляроў і садоўнікаў прайшла ў Пінску.

Мерапрыемства прымеркавалі да юбілею "бацькоў" беларускага вінаграда: 125-годдзя Івана Шаўчука і 75-годдзя Рамуальда Лойкі. Абодва пінчаніны прысвяцілі сваё жыццё вывучэнню і развіццю вінаградарства на беларускіх землях.

Жыхарам горада над Пінай прадставілі некалькі дзясяткаў гатункаў вінаграду, мёду, кветак і рознай садавіны, а мясцовы завод він частаваў гасцей мерапрыемства сваёй прадукцыяй з беларускага вінаграду.

Ракавая пасада

Палкоўнік Алег Двігалёў прызначаны камандуючым Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь.

Раней Алег Двігалёў займаў пасаду начальніка Галоўнага штаба — першага намесніка камандуючага ВПС і войскамі СПА Узброеных сіл.

Нагадаем, што папярэднія камандуючыя ВПС і войскамі СПА доўга на сваіх пасадах не затрымліваліся. Апошні камандуючы Дзмітрый Пахмелкін быў адпраўлены ў адстаўку 31 ліпеня "за неналежнае выкананне службовых абавязкаў па гарантаванні нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь". Гэта было рэха "плюшавага дэсанту".

Грыбы ці жыццё?

Пачасціліся выпадкі, калі людзі, ідучы ў лес за грыбамі і ягадамі, губляюцца ў лесе, не могуць знайсці дарогу назад самастойна. Колькасць такіх выпадкаў за дзень часам дасягае 3—4, а то і больш, паведамляе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

У мінулыя выхадныя выратавальнікі вымушаны былі шукаць двух чалавек у Дубровенскім раёне Віцебскай вобласці. У лесе Мінскага раёна ўдалося знайсці адразу чатырох аматараў ціхага палявання, якія згубіліся. Шчасліва скончыўся аналагічны выпадак і ў лесе Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці. А вось у Петрыкаўскім раёне Гомельскай і Маладзечанскім раёне Мінскай абласцей работы па пошуку зніклых грыбнікоў працягваюцца. На раніцу панядзелка таксама не ўдалося ўстанавіць месцазнаходжанне мужа і жонкі ў лесе Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці, якія, заблукаўшы, выйшлі па мабільным тэлефоне на сувязь з сынам.

У сувязі з гэтым супрацоўнікі МНС звяртаюць увагу на тое, што аматарам збіраць грыбы і ягады (асабліва пажылым) варта памятаць простыя правілы, якія дапамогуць хутчэй адшукаць іх у лесе. Так, збіраючыся ў лес, неабходна выбіраць вопратку не ахоўнай афарбоўкі, напрыклад шэра-зялёнай, якая зліваецца з навакольным асяроддзем, а яркага колеру. Асабліва важна мець пры сабе мабільны тэлефон, каб пры неабходнасці выйсці на сувязь і паведаміць аб сваім месцазнаходжанні. Акрамя таго, не варта паглыбляцца ў лес, калі мясцовасць не надта знаёмая.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
11 ВЕРАСНЯ 2012 г.

КОРОТКО

Ирак: 16 взрывов в один день

16 взрывов прогремели в воскресенье в нескольких городах Ирака. Жертвами терактов стали около 100 человек, 400 ранены.

В Киркуке бомба взорвалась у офиса нефтяной компании, погибли 8 человек. Самыми смертоносными были взрывы у города Амары в 300 километрах к югу от Багдада — здесь взлетели на воздух два заминированных автомобиля. Погибли 16 человек, более 100 получили ранения.

"Эскалация насилия и террора связана с нехваткой технического оснащения и недостатками в работе разведслужб. Эти факторы наряду с другими позволяют террористам использовать тактику "стреляй и убегай". Вот почему блокпосты и военные становятся легкими мишенями для нападающих", — считает аналитик Али аль-Хайдари.

После вывода войск США ситуация в Ираке еще больше обострилась, и все громче звучат голоса, утверждающие, что иракские власти не способны самостоятельно обеспечить безопасность в стране.

Открылся форум кинопремьер

Ежегодный форум кинопремьер начал работать в канадском Торонто. Это фестиваль, в котором нет конкурса, нет наград, а есть лишь показы, сеансы, просмотры.

Лучшим автомобилем среднего класса стала Mazda

Московский автосалон завершится в ближайшие выходные.

Тем временем представители СМИ сделали свой выбор и назвали самые интересные новинки Московского автосалона. Главным и лучшим автомобилем среднего класса стала новая Mazda6. А вот автомобилем мечты акулы пера выбрали Bentley Continental GT Speed.

В номинации "Лучший городской автомобиль" победителем стал компактный Smart. Лучшим автомобилем малого класса назвали Mini John Cooper Works Countryman ALL4 — модернизированную специально для Московского автосалона версию кроссовера.

Наиболее интересным автомобилем бизнес-класса была выбрана новая Toyota Camry. Премьера машины прошла задолго до выставки, однако новинка только набирает популярность в России. Лучший автомобиль представительского класса — Rolls-Royce Ghost. Среди внедорожников пальма первенства досталась Volkswagen Touareg.

Итоги саммита АТЭС удивили СМИ

Завершившийся во Владивостоке саммит организации Азиатско-Тихоокеанского экономического сотрудничества (АТЭС) удивил результативностью и оказался для России неожиданно удачным.

Форум АТЭС — это по определению площадка для дискуссий и разработки планов, а не для принятия решений. Однако нынешний саммит стал исключением. На нем не только встретились лидеры ведущих держав региона (Китая, России, США, Японии), но и было подписано множество различных соглашений.

Центр мира смещается в Азию, считают ведущие ученые и политики. И Россия в данном случае старается не только не отстать, но даже стать одним из лидеров этого процесса.

В работе саммита принимала участие государственный секретарь США Хиллари Клинтон. Вместе с российским министром иностранных дел Сергеем Лавровым они подписали меморандум об укреплении российско-американского научного сотрудничества в Антарктике.



Лагер для бежанцаў

У Іарданіі адкрыўся чарговы лагер для бежанцаў з Сірыі.



«Прывітанне» ад тайфуна

Вось так ён надыходзіў на кітайскую правінцыю Гірын.

АВТОРИТЕТНОЕ МНЕНИЕ

Швейцария, Сингапур и Финляндия возглавили рейтинг глобальной конкурентоспособности

В ежегодном рейтинге глобальной конкурентоспособности, составленном на основе данных по 144 странам, верхние строчки заняли Швейцария, Сингапур и Финляндия, в то время как на последнем месте оказалось государство Бурунди.

Большинство мест в десятке самых конкурентоспособных государств занимают западные страны. Азия представлена в десятке Сингапуром, Гонконгом и Японией.

США остаются страной с исключительно продуктивной экономикой, но уже четвертый год подряд их позиции снижаются. В этом году страна занимает седьмое место в рейтинге глобальной конкурентоспособности.

Ведущий экономист Всемирного экономического форума Дженнифер Бланке сообщила "Голосу Америки", что США все еще являются мощным двигателем инноваций в мире. Америка может гордиться эффективной работой своего рынка и одними из лучших университетов в мире, но у нее есть и слабые стороны, негативно отражающиеся на ее конкурентоспособности, считает эксперт.

"Сохраняется тревога в отношении макроэкономической среды, увеличения госдолга, которое вытекает из неспособности взять под контроль государственные расходы и настоящего политического тупика в решении этого вопроса. А это ведет к обеспокоенности работой политических институтов в целом. Деловые круги сомневаются в том, что политики способны принимать решения, необходимые для движения вперед", — сказала она.

Составители доклада считают, что Азиатско-Тихоокеанский регион является одним из самых динамично развивающихся регионов мира. Особенно хорошие показатели у Сингапура, Гонконга, Японии, Тайваня, Китая и Южной Кореи.

Хотя Китай опустился в рейтинге на три строчки — до 29-го места, в докладе отмечается, что он по-прежнему обгоняет другие страны БРИК — Бразилию, Россию и Индию. Из этих четырех стран только Бразилии удалось повысить свои позиции в рейтинге.

Россия оказалась на 67-м месте, снизившись за год на одну строчку.

Экономист Бланке говорит, что пока не ясно, может ли мир надеяться на рост в ближайшие годы в условиях, когда экономики Китая и Индии замедляются.

"Европейцам нужно разобраться с кризисом суверенного долга в своих странах и вновь вывести их на путь роста, — сказала Бланке. — Им нужно мыслить в терминах долгосрочной перспективы, нужно навести порядок в макроэкономике, нужно думать об инвестициях, которые будут способствовать этому. Но и китайцам тоже нужно продолжать работу над собственным рынком".

В докладе говорится, что на страны Ближнего Востока и Северной Африки продолжает оказывать воздействие политическая нестабильность. В рейтинге этого года отсутствует Сирия, поскольку его составителям не удалось собрать необходимые данные.

Авторы доклада пришли к выводу, что страны Африки, расположенные к югу от Сахары, достигли поразительных успехов за последние 15 лет. Их экономический рост за последние два года превысил пять процентов. ЮАР и Маврикий оказались в верхней половине рейтинга. Гана и Руанда поднялись на 11 и 7 позиций соответственно. Либерия и Сейшельские острова в этом году впервые были включены в рейтинг.

В то же время в докладе отмечается, что африканские страны к югу от Сахары отстают от остального мира по конкурентоспособности и континент в целом не окажется среди основных игроков на мировом экономическом поле, если здесь не пройдут реформы правительств и общественных институтов.

У СОСЕДЕЙ

Оппозиция собрала полмиллиона подписей к иску против Януковича

Лидеры Объединенной оппозиции "Батькивщина" Александр Турчинов и Арсений Яценюк подали в Высший административный суд Украины иск против президента Украины Виктора Януковича. Главу государства обвиняют в узурпации власти, сообщает пресс-служба "Батькивщины".

К документу приложены подписи более чем 500 тысяч граждан, которые поддерживают жалобу на Януковича. По мнению Турчинова, столь большое число подписей свидетельствует о том, что "все перестали бояться власть".

"Сотни тысяч украинцев уже понимают, что... мы начинаем процесс, который рано или поздно будет завершен. Он будет завершен импичментом действующему президенту, восстановлением правосудия, демократии и европейского пути нашей страны", — заявил Турчинов.

Иск сопровождается также 50-страничным приложением, в котором расшифровывается перечень преступлений, которые, по мнению истцов, совершил глава государства. В частности, в нем отмечается, что Виктор Янукович нарушил конституцию страны, незаконно подписав законы о пенсионной реформе, о языках, налоговый кодекс. Он незаконно назначил премьер-министра и правительство и оказывал давление на судей конституционного суда, передает "Интерфакс", ссылаясь на слова Арсения Яценюка.

"Когда он шел на выборы, он многое обещал. В результате он захватил власть, и страна фактически находится в состоянии экономического спада", — цитирует слова Яценюка пресс-служба "Батькивщины".

ПОГЛЯД З ЗАХАДУ

Сланцавы газ змусіць Пуціна з торбаю хадзіць

Расія прайграе канкурэнцыю са сланцавым газам і нафтай з ЗША.

Скарачэнне нафтагазавых даходаў можа перашкодзіць Крамлю выканаць свае абяцанні — узбагаціць расійскі народ. Больш падрабязна гэтую тэму асвятляе "Gazeta Wyborcza".

Уладзімір Пуцін гучна заявіў, што Расія ўвайшла ў новы этап свайго развіцця. У бліжэйшыя 10 год у краіне з'явіцца 25 мільёнаў новых працоўных месцаў у сферы высокіх тэхналогій. Раз на 15 год расіяне змогуць набыць сабе новае жытло, а краіну чакае інвестыцыйны бум. Напрыклад, ваенная прамысловасць павінна атрымаць каля 680 мільярдаў долараў.

Грошы на фінансаванне гэтых абяцанняў бяруцца з продажу нафты і газу. Летась гэтая крыніца даходу сфарміравала палову бюджэту краіны. Усё дзякуючы высокім цэнам на энергарэсурсы ў свеце. Сёлета расійская нафта каштуе 115 долараў за барэль, тады як у 2009 годзе было толькі 60 долараў. Не меншыя даходы прыносіць продаж газу.

Аднак рэалізацыі стратэгічных планаў Пуціна можа перашкодзіць амерыканская тэхналогія па здабычы са сланцавых парод газу і нафты. Напрыклад, у гэтым годзе "Газпром" прадасць газу на 9% менш, чым у мінулым. Менавіта таму Крэмль не раз крытыкаваў на міжнародных сустрэчах гэтую тэхналогію як небяспечную і шкодную для навакольнага асяроддзя.

Паводле разлікаў расійскага ўрада, з 2016 года пачнецца кашмар для расійскага манапаліста. Канада і ЗША пачнуць пастаўляць на сусветны рынак звадкаваны газ са сланцавых радовішчаў. Каб утрымаць сваю пазіцыю, "Газпром" мусіць павялічыць здабычу на 50% да 2030 года. Аднак гэта нерэальна, прызнаў расійскі міністр энергетыкі.

Сёння расійскі газ каштуе для Еўропы ад 400 да 550 долараў за 1000 кубаметраў. Блізкаўсходні газ — 320 долараў, а амерыканскі сланцавы газ — 100 долараў. Такім чынам, "Газпром" прайграе канкурэнцыю, падсумоўвае польскае выданне.

Подтвердил намерение принять Грузию в НАТО

В Тбилиси генсек НАТО Расмуссен в очередной раз выразил поддержку альянсом территориальной целостности Грузии и ее суверенитета, а также подтвердил намерение принять эту страну в ряды НАТО.

Конфликт между Россией и Грузией в 2008 году стал попыткой помешать расширению альянса в регионе, отметил он и добавил: *"Ни одна страна не имеет права вмешиваться в решения НАТО и нашу политику открытых дверей. Любая страна должна сама решать, быть ей с нами или нет. Надеюсь, Россия уважительно отнесется к подобным решениям".* Он в очередной раз подтвердил намерение альянса принять Грузию в свои ряды.

ХОРОШИЙ ПРИМЕР

Президент, начни с себя!

Президент Греции Каролос Папульяс просит Минфин сократить ему зарплату и пенсию, сообщил заместитель министра финансов Христос Стаикурас на заседании бюджетного комитета парламента.

Глава государства также предложил сократить пенсии всем бывшим президентам Греции, что, по оценке министерства, сэкономит государственному бюджету около 350 тысяч евро в год, сообщает "Прайм" со ссылкой на греческий телеканал "СКАЙ".

По мнению президента, зарплата главы государства должна быть уменьшена вместе с сокращением зарплаты министров и других госслужащих.

Между тем министр финансов Греции заявил в феврале после встречи с президентом, что Папульяс отказался от зарплаты, чтобы поддержать страну в кризис. Тогда сообщалось, что зарплата президента составляет 23 тысячи евро в месяц, или 278,4 тысячи евро в год, а после уплаты налогов он получает 192 тысячи евро. Теперь, как полагают СМИ, будет определен новый размер зарплаты главы государства.

Греция в кризис резко сокращает государственные расходы, в частности, на зарплаты и пенсии. Премьер-министр Антонис Самарас, во главе правоцентристской партии "Новая демократия" выигравший с небольшим преимуществом досрочные выборы 17 июня, с самого начала своего премьерства сократил зарплаты министрам на 30%. Самарас также упразднил все специальные комиссии и секретариаты при правительстве страны, которые обходились государству в существенную сумму, максимально ограничил использование министрами служебных автомобилей, закрыл в своей резиденции ресторан для служащих администрации, на содержание которого выделялось 63 тысячи евро ежегодно.

Арафат умер или убит?

Спустя восемь лет после смерти Ясира Арафата прокуратурой Нантера начато предварительное следствие по факту возможного убийства, пишет издание Le Figaro. Решение было принято после того, как жена бывшего палестинского лидера Суха Арафат подала иск об убийстве, отмечается в статье. Палестинская автономия поддержала это решение, заявив, что Махмуд Аббас официально попросил президента Франции Франсуа Олланда помочь в расследовании обстоятельств смерти Арафата. Расследование канала "Аль-Джазира", результаты которого стали известны в начале июля, вызвало возобновление споров о кончине Ясира Арафата, напоминает издание. Согласно данным Института радиофизики Лозанны, его личные вещи содержат повышенную дозу полония. Это открытие побудило Суху Арафат подать жалобу во французский суд в конце июля.

Сайт Slate опубликовал часть медицинского досье Ясира Арафата от 14 ноября 2004 года. В нем говорится, что 12 октября 2004 года через четыре часа после ужина палестинский лидер страдал от тошноты, рвоты, болей в брюшной полости, диареи и проблем со свертываемостью крови. Арафат умер во французском госпитале Перси до того, как врачи успели разрешить загадку.

Slate выдвигает гипотезу отравления ядовитыми грибами. "Все симптомы соответствуют отравлению токсинами мухомора или гриба-паутинника", — утверждает профессор Марсель Франсис-Кан, бывший глава службы ревматологии госпиталя Биша. Несколько дней назад Институт радиофизики Лозанны заявил о готовности провести обследование останков палестинского лидера.

В США испытали «Укус гадюки»

Американские военные провели очередные успешные испытания новой авиабомбы GBU-44/E под кодовым названием "Viper Strike" ("Укус гадюки"). Это высокоточная бомба с лазерным наведением Легкий и маневренный снаряд способен поражать как воздушные, так и наземные цели с расстояния до 5 километров. Бомбой собираются вооружать военные беспилотники.

Испытания новой бомбы проходили в штате Нью-Мексико в течение двух дней. Тестируемая военная разработка показала себя во всей красе — бомба успешно поразила восемь мишеней, летевших на большой скорости.

Испытания новой бомбы ведутся уже почти 10 лет. По некоторым данным, "Укус гадюки" уже был испытан в реальных боевых условиях в 2007 году. Тогда, как сообщал портал strategypage.com, бомбу опробовали на террористах.

Длина сигарообразной бомбы, снабженной "оперением", как у волана, составляет всего 90 сантиметров, отмечается в пресс-релизе Минобороны США. Вес — чуть больше 19 килограммов.

Астероид размером примерно в полкилометра пролетит мимо Земли утром 14 сентября

Он был впервые обнаружен участниками американского проекта "Каталина", главная задача которого состоит в поиске малых тел Солнечной системы — астероидов и комет. По оценкам ученых, размер этого тела составляет от 200 до 500 метров.

Астероид пролетит на расстоянии 0,019 астрономической единицы (2,84 миллиона километров, или около 7,4 среднего расстояния от Земли до Луны). Таким образом, астероид 2012 QG42 попадает в число потенциально опасных — в этот класс включаются все тела размером более 100 метров, приближающиеся к Земле на дистанцию менее 0,05 астрономической единицы.

В будущем 2012 QG42 будет пролетать еще ближе к Земле. Так, 15 сентября 2039 года он пролетит на расстоянии 0,014 астрономической единицы (5,6 дистанции до Луны).



Белая вячэра

Яна адбылася ў Сінгапуры. На ёй усе госці павінны быць у белым, прыйсці са сваімі сталамі, крэсламі таксама белага колеру. Ідэя такой вячэры-флешмоба ўзнікла ў Парыжы 24 гады таму.

КОШЕЛЕК

Как изменились цены на продукты за год

Едва ли не каждый день меняются ценники в магазинах. Так потихонечку цены на некоторые продукты выросли за год вдвое. Например, на яйца, сыры, колбасы. Хотя можно отыскать продукты, которые год назад стоили дороже, чем сейчас. Их мало, но они есть. Например, гречка, консервированный зеленый горошек, некоторые виды макарон.

Сайт kp.by опубликовал сравнительную таблицу цен на продукты на Комаровском рынке Минска в августе этого года и прошлого:

Продукт	Цена в августе 2011 года (в руб.)	Цена в августе 2012 года (в руб.)
Хлеб “Водар”	3710	5750
Батон “Столичный”	2950	4700
Молоко питьевое, жирность 3,2%, 1 литр, тетрапак	2850	5600
Кефир, 1 литр, жирность 3,2%, пленка	2490	5200
Масло “Крестьянское”, Минск, 200 г	4600	8600
Сыр “Российский”, 1 кг	23 230	47 500
Сметана, 0,5 литра, жирность 26%	4000 (жирность 25%)	9500
Сосиски “Молочные”, 1 кг	24 900	30 000—48 000 (цена зависит от производителя)
Колбаса сырокопченая “Брауншвейгская”, 1 кг	59 000	139 900
Филе цыпленка бройлерного, РБ, 1 кг	28 900—30 000	50 900
Филе свинины (для отбивных), 1 кг	45 000—50 000	65 000—85 000
Фарш (говядина + свинина), 1 кг	25 000	38 000
Селедка “Матиас Оригинал”, 250 г	7260	13 500
Шпроты в масле (баночка 160 г), Латвия	8100	12 900
Зеленый горошек, 420 г	5950	4500
Кукуруза, 340 г	5950	6750
Яйца “Молодецкие”, Д-1, десяток	4600—5000	9800—10 000
Макароны “Галина Бланка”, рожки, 450 г	11 000	10 500
Гречка, упаковка 900 г	19 900	9100
Рис, упаковка 900 г	7580	9900
Кетчуп “Чумак Шашлычный”, 300 г	7000	7300
Морковка, 1 кг	3000	5000—6000
Картошка, 1 кг	1500—1800	2500—4000
Помидоры, РБ, 1 кг	3000—4000	7500—9500
Огурцы, РБ	3000—4200	6500—7500
Перец красный, 1 кг	21 500	19 000—22 000
Бананы, 1 кг	4500—5000	7000—11 000
Апельсины, 1 кг	6000	13 000—23 000
Яблоки, 1 кг	7000—7500	5000—6000
Курага, 1 кг	29 000	44 800
Сок “Меджик Саммер”, апельсиновый, 1 литр	4800	10 900
Кофе “Чибо Фэмили”, 250 г*	25 000	40 000—42 000
Чай “Ахмад — Английский завтрак”, 100 г	14 900	25 000
Мука “Лидская”, 1 кг, высший сорт	2800	4680
Сахар, 1 кг	5000	8000
Водка “Стольградная”, 0,5 л*	9920	36 200
Пиво “Туборг”, 0,5 литра в металлической банке*	9600	15 000
Шампанское “Советское”, полусладкое, РБ*	12 990	35 200

** Цены в продуктовых магазинах, поскольку данный товар отсутствовал в продаже на Комаровском рынке.*



СІТУАЦЫЯ

Штотыднёвыя суботнікі ў Мінску ўваходзяць у практыку

Гораду не хапае каля 3 тысяч дворнікаў. Прыбіраюць дваровыя тэрыторыі самі мінчане. У летніх суботніках прынялі ўдзел каля 15 тысяч жыхароў Мінска.

— *Штотыднёвыя суботнікі працягнуцца і ўвосень,* — заявіла агенцтву “Мінск-Навіны” прадстаўнік дзяржаўнага аб’яднання “Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка” Маргарыта Язінская.

Дзівіцца тут няма чаму. Сёння ў жыллёвых службах Мінска працуюць 6980 рабочых па комплекснай уборцы, а неабходна 9712. Не хапае амаль 3 тысяч работнікаў. Акрамя таго, патрабуюцца дворнікі ў школах, бальніцах, крамах, на прадпрыемствах. У гарадской жыллёвай гаспадарцы разумеюць, што прывабіць на працу можна толькі добрай зарплатай. А сёння сталічныя дворнікі зарабляюць мала. У сярэднім 1,5—1,8 млн рублёў у месяц. У некаторых арганізацыях і таго менш. Калі на сайце вакансій Міністэрства працы і сацыяльнай абароны знайсці старонку, дзе сабраны прапановы па горадзе Мінску, то можна ўбачыць, што дворнікі вельмі запатрабаваны ў арганізацыях адукацыі, бальніцах. Але прапануюць ім вельмі сціплую зарплату — 1 мільён, 1 мільён 200 тысяч. Толькі ў некаторых сталічных гасцініцах, дзе патрабуецца дворнік, прапаноўваюць зарплату 3 мільёны ў месяц.

— *Кіраўніцтва нашага аб’яднання да наступлення зімы мае намер не толькі захаваць наяўную колькасць рабочых па комплекснай уборцы, але і павялічыць яе,* — адзначыла Маргарыта Язінская. — *Перш за ўсё за кошт павышэння зарплаты — гэтае пытанне зараз разглядаецца. Таксама для дворнікаў плануецца стварыць неабходныя ўмовы — абсталяваць бытоўкі, даць спецвопратку, інвентар, забяспечыць тэхнічную падтрымку ў выглядзе снегаўборачных машын. З прадпрыемствамі, навучальнымі ўстановамі, вайсковымі часцямі дамаўляемся, якую дапамогу яны могуць аказаць у час снегападаў і іншых надзвычайных з’яў надвор’я.*

Гэта значыць, што мінчане павінны быць гатовы самі прыбіраць свае двары. На суботніках.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.



ЧУЛІ?

З-за хакея некаторыя студэнты застануцца без канікул

Ды і не ўсе выкладчыкі змогуць атрымаць летні адпачынак

Міністэрства адукацыі зацвердзіла графік навучальнага працэсу на 2013/14 навучальны год для ВНУ, інтэрнаты якіх падчас чэмпіянату свету па хакеі-2014 будуць выкарыстоўвацца для турыстаў.

Згодна з паведамленнем Міністэрства адукацыі, графік будзе такім.

Пачнецца 2013/14 навучальны год у панядзелак, 2 верасня 2013 года. Восеньскі семестр скончыцца 22 снежня 2013 года. Затым будзе заліковая сесія — па 12 студзеня 2014 года. А вось канікул не будзе, бо адразу пасля сесіі пачнецца вясновы семестр — з 13 студзеня па 30 сакавіка 2014 года. Затое з 31 сакавіка па 1 чэрвеня 2014 года студэнтам дадуць вялікія канікулы.

Вучыцца па гэтым графіку будуць студэнты 1—4-х курсаў БДУ, БДУІР, БДЭУ, БДМУ, БДПУ ім.М.Танка, МДЛУ, БДТУ.

Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт адмовіўся ламаць графік навучальнага працэсу.

“Мы лічым, што ў гэтым няма неабходнасці. Няма чаго ламаць увесь навучальны працэс і адпускаць педагогаў у адпачынкі яшчэ да пачатку лета. Як-небудзь выкруцімся: можа, трохі ўшчыльнім студэнтаў у інтэрнатах. Паглядзім. Часу яшчэ дастаткова”, — цытуе “Інтэрфакс” прадстаўніка кіраўніцтва вядучай інжынернай ВНУ краіны.

ДА ВЕДАМА

У так званай студэнцкай вёсцы падчас хакейнага чэмпіянату плануецца задзейнічаць каля 7 тысяч месцаў. У той жа час у пяці дзеючых інтэрнатах ВНУ — прыблізна 4700 месцаў.

НА СВАЕ ВОЧЫ

Да Вітаўскай крыніцы едуць з усёй Беларусі

Цудадзейнаю вадою лечаць вочы і хворыя суставы

На тыдні журналісцкая вандроўка прывяла мяне ў Вітаўку — невялікую вёску на беразе Пцічы. Паселішча хоць і блізка ад сталіцы, якіх 20 вёрст, але сапраўдная глыбінка: ні табе гладкіх дарог, ні сучасных харомаў. Затое якая раскоша зяляніва, багацце краявідаў: цяністыя дубравы, парослыя разнатраўем лагчыны-балаціны, пакатыя ўзвышшы, скрозь усланыя мурагамі... А над тымі мурожнымі пагоркамі — векавыя дубы, таўшчэзныя вязы, бярозавыя гайкі... Водар паветра такі, што хоць маж яго на скібы ды глытай замест мёду!

Вузкай дарожынай, схаванай у засені купчастых дрэў, кіруемся з Данілавічам, маім суправаджальнікам, да Вітаўскай крыніцы... Ён і расказвае мне гісторыю Вітаўкі і тае святой крынічкі, да якой мы зараз набліжаемся і да якой (дзіва дзіўнае!) ідуць ды едуць людзі не толькі з наваколля, але адусюль — з Расіі, Украіны, Малдовы, Літвы, Польшчы...

«Праз год, як крынічку замуравалі, яна зноў прабіла сабе дарогу»

— Некалі, за даўнім часам (калі верыць сівой легендзе), жыў тут і гаспадарыў пане Віт — не то княжыч, не то баярын, — распавядае Данілавіч. — Дык вось, была ў яго прыгажуня-дачка, і баяўся княжыч за яе жыццё. Бо наўкола шведы скрозь — вайна тады была, а не як цяпер... Гэта, братка, не якія-небудзь “плюшавыя мядзведзікі”, а самыя сапраўдныя разбойнікі прыпёрліся... Карацей, было так. Уначы чуе княжыч голас: “Віт, Віт, бяры хутчэй стрэльбу ды стрэльні!”

Падумаў было княжыч, што здалося яму спрасонку, але голас зноў яму: “Віт, Віт, бяры стрэльбу ды палі па непрыяцелю, а то забяруць дачку...” Выйшаў тады княжыч на ганак, а ў двары і напраўду шведы-разбойнікі — поўны двор... І пачаў па іх лупіць Віт са сваёй стрэльбы — разбегліся хціўцы: каго балота засмактала, каго куля панская напаткала... Раніцай дайшло да Віта, што голас папераджальны — знак Божы, значыцца, трэба неяк аддзячыць Госпаду. І тады княжыч пабудаваў царкву, каб не адно сабе, а каб і галота хадзіла сюды на споведзь... Толькі не доўга княжыч трымаўся Боскіх запаведзяў — пачаў грашыць, людзей прыніжаць, глуміцца з іх. Скончылася тым, што аднойчы царква разам з панскім дваром патанула ў балоце, дрыгва засмактала і самога пана-крывасмока... А праз нейкі час на гэтым месцы забіла крыніца, і тады ўжо людзі пабудавалі новую царкву. А з крыніцы пачалі чэрпаць ваду. Тую вадзіцу не толькі пілі, але і лекаваліся, бо гаючая была... Месца ж пачало называцца Вітаўка, якніяк, а з пана-крывасмока ўсё пачалося...

— У ХІХ стагоддзі ў Вітаўцы было ўсяго толькі два двары і 17 жыхароў — і гэта ўжо не легенда, а чыстая праўда, — распавядаў далей Данілавіч. — Пры бальшавіках народу стала нашмат болей, бо з уласных двароў ды хутароў усіх чыста пазганялі ў калгас.

— І што сталася з царквой і крынічкай? — прыспешваю дзядзьку Анатоля. — Няўжо зноў праглынула багна?

— Не, не было прычыны, бо людзі — не ў прыклад крывасмоку-пану — жылі па законах Божых, трымаліся веры сваёй і маліліся. Затое прыйшла напасць з другога боку: бязбожнікі-камуністы разбурылі царкву, а крынічку святую (на той час яна такой лічылася) замуравалі бетонам. Здарылася гэта ў 1935-м, а перад тым — у 1930 годзе — нкусаўцы арыштавалі і рэпрэсіравалі мясцовага бацюшку Іаана Лянчэўскага і іерэя Аркадзя Акаловіча. Як разбурылі вітаўскую драўляную Свята-Праабражэнскую царкву, то з яе пабудавалі ў суседніх Чаркасах клуб, а іконы, царкоўныя рэчы папросту спалілі. Больш за ўсё людзі з навакольных вёсак шкадавалі драўляны абраз Збавіцеля, які асабліва ўшаноўвалі. Лічылася, што гэты абраз пазбаўляе хворых, якія маліліся перад ім, ад хваробы. Калісьці якраз каля царквы біла гаючаю вадою крынічка. Тая самая, да якой мы і кіруем зараз. Людзі ішлі да яе, каб вылечыць захворванні вачэй. Але вось што цікава: праз год, як крынічку замуравалі, яна зноў прабіла сабе дарогу — праз пясок. Вестка хутка абляцела ўсіх, і людзі з радасцю ішлі знаёмай сцяжынай. На царкоўныя святы збіралася ўся Вітаўка, людзі з іншых вёсак. На Уздзвіжанне прыходзіла асабліва шмат народу — была святасць, і было свята...

— А як усё разгортвалася далей, Анатоль Данілавіч?

— Гісторыя царквы, як і гісторыя цудадзейнай крынічкі, мела свой працяг, амаль праз паўстагоддзя адкрылася яе новая адраджэнцкая старонка... Спачатку, у 2002 годзе, айцец Уладзімір з Фаніпальскай царквы ўзвёў на месцы, дзе раней стаяла Свята-Праабражэнская царква, дубовы крыж. Затым, у 2005 годзе, як ужо пралегла сцяжына да таго крыжа і святой крыніцы, людзі пабудавалі калодзежавы зруб і купель... Сам я шчыраваў над тым зрубам і дубовым жолабам, па якім крынічная вада цячэ ў купель. Але, па ўсім, злыдні былі, ёсць і будуць ва ўсе часы: аднойчы — якраз было на Вялікдзень — нейкія вандалы падпалілі калодзежавы зруб, пашкодзілі жолаб... Цяпер не той выгляд, але галоўнае, што народная сцяжына сюды не зарасце ніколі. Ні ўзімку, ні ўлетку! Святая вада крынічная, дарэчы, у любую пару года заўсёды шэсць з паловай градусаў на плюс. І лечыць не толькі вочы, але і хворыя суставы...





«Ідуць і прыязджаюць здалёку цэлымі сем’ямі»

Вось мы і на месцы. У трохкутніку абрамленай высознымі дрэвамі паляны — упрыгожаны квеценню Крыж Жыватворчы Гасподні, Святая крыніца з купеллю і часовы храм на колах з залатым купалам-макаўкай. Сустрэла нас ахоўніца і распараджальніца маленькага храма спадарыня Алена. Але папярэд заўважаю, дакладней, чую жаночыя галасы і плёскат вады з зачыненай купелі...

— Дзяўчаты з Чаркасаў прымаюць амавенне-ачышчэнне, — тлумачыць Алена. — Спачатку купель, потым нап’юцца самой вадзіцы. Усе кажуць, што пасля купелі ўвесь тыдзень адчуваюць бадзёрасць, прысутнасць Госпада. Вада са святой крыніцы не толькі ўмацоўвае дух, але і цела, асабліва ў тых людзей, якія пакутуюць ад хворасці вачэй, суставаў...

— Спадарыня Алена, як часта наведваюцца сюды людзі? І хто ў бальшыні — старыя, маладыя, падлеткі?..

— Ідуць і прыязджаюць здалёку і цэлымі сем’ямі. Так што ўсіх хапае. Але мушу зазначыць: сюды лепш ісці з верай у Госпада, з пакаяннем... Таму людзі ідуць спачатку да Крыжа, каб памаліцца, пакаяцца, папрасіць у продкаў прабачэння... Паломнікі ідуць і ідуць — з навакольных вёсак, з розных куткоў Беларусі, шмат замежнікаў...

— Ну, а як жа царква? Ці будзе тут наноў пабудаваны Вітаўскі храм?

— Храм ужо будуецца, але ў суседніх Чаркасах, а тут з часам пабудуецца каплічка. Пакуль жа гэты часовы храм на колах. Тут і прымаем трэбнікі, раздаём царкоўную літаратуру...

На развітанне п’ю чыстую, як сляза, вадзіцу, а пасля акунаю і галаву ў купель. Спадарыня Алена дае нам вандроўныя іконкі святых: “Хай яны аберагаюць вас на жыццёвым шляху, як аберагаюць яны ўсіх, хто веруе...”

Ужо крануўшыся ў зваротны шлях, кажу Данілавічу: як добра, што людзі зноўку пацягнуліся да святых месцаў. Значыцца, не згасла вера, не выветрылася за нядобрым часам, га?

Той, на здзіўленне, не дужа ўзрушыўся маім запалам...

— Можа, яно і так, — адказвае, — што вера не згасла, але ж дзе той народ?.. Вунь цэлыя вёскі выміраюць, адно бадыллём пазарасталі. Хочаш, пакажу адну такую, тут недалёка... Завецца, дакладней звалася — Цяўлава...

Што заставалася? Канечне, мы рушылі ў памерлую вёску, і ўсё я там пабачыў на свае вочы. Але гэта ўжо другая гісторыя, пра яе іншым разам...



Георгій ЧЫГІР.
Фота аўтара.

АБІТУРЫЕНТ-2013

Прадметаў на ЦТ паменее?

Сёлетнім 11-класнікам не пазайздросціш. Дагэтуль не вядома, па якіх правілах пройдзе ўступная кампанія—2013.

Хутчэй за ўсё на цэнтралізаваным тэсціраванні скароцяць колькасць прадметаў. Небезвядомы рэфарматар адукацыі і нязменны старшыня камісіі па кантролі за паступленнем **Анатолій Рубінаў** зрабіў заяву, што *“14 прадметаў — гэта шмат. Навошта такая дэталізацыя? Можна іх як мінімум у два разы скараціць”.* Рубінаў заявіў, што скарачэнне колькасці тэстаў будзе добрай эканоміяй, бо на правядзенне тэстаў выдаткоўваецца нямала сродкаў, а некаторыя прадметы, як, напрыклад, грамадазнаўства, гісторыя Беларусі, піша няшмат абітурыентаў.

Днямі міністр адукацыі **Сяргей Маскевіч** падтрымаў ідэю Анатолія Рубінава і заявіў, што *“неабходна зменшыць колькасць прадметаў на цэнтралізаваным тэсціраванні, згрупаваць спецыяльнасці па кірунках, каб іх больш уніфікаваць”.*

Якія яшчэ могуць быць змяненні ў правілах прыёму ў ВНУ? Хутчэй за ўсё адменяць ільготы пры паступленні для выпускнікоў вясковых школ — Міністэрства адукацыі гэта ўжо абяцала. Падумваюць у ведамстве і над тым, каб пазбавіць пераможцаў алімпіяд магчымасці паступаць па-за конкурсам на некаторыя спецыяльнасці. Але што будзе дакладна, стане вядома ў лістападзе, калі, як абяцаюць у Мінадукацыі, скончыцца абмеркаванне правілаў.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

РЭГІСТРАТУРА

14% сямейных пар бясплодныя

У палове выпадкаў павінны ў гэтым мужчыны. Хаця яшчэ нядаўна толькі 40% бяздзетных пар не маглі завесці дзіця з-за праблем са здароўем у мужа.

Рост такой статыстыкі спецыялісты звязваюць з тым, што беларускія мужчыны абыякава ставяцца да свайго здароўя. Намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя **Таццяна Мігаль** паведаміла, што беларускіх мужчын, асабліва працаздольнага і рэпрадуктыўнага ўзросту, не зацягнуць у паліклініку, некаторыя не здаюць аналізы дзесяцігоддзямі, не бываюць на прыёме нават ва ўчастковага тэрапеўта, не кажучы ўжо пра вузкіх спецыялістаў. У прыватнасці, на прыёме ў андролага пацыентаў няшмат.

— Мужчын трэба прывучаць да рэгулярных абследаванняў, культываваць моду на мужчынскае здароўе, — лічыць спецыяліст. — Дарэчы, жанчыны ў гэтым плане знаходзяцца ў больш выгадным становішчы, паколькі за апошнія гады атрымалася дасягнуць адчувальных пазітыўных зрухаў у іх адносінах да свайго здароўя.

ТЫМ ЧАСАМ

Амаль кожныя трэція роды працякаюць з ускладненнямі

І гэта пры тым, што сітуацыя пачала мяняцца ў пазітыўны бок. У 2000 годзе ўвогуле толькі ў 25% цяжарных жанчын роды працякалі без якіх-небудзь ускладненняў. За 6 месяцаў гэтага года ўдзельная вага родаў без ускладненняў павысілася да 38%. Але ў той жа час у мінулым годзе ў сярэднім 73 жанчыны з 100 мелі тое ці іншае захворванне падчас цяжарнасці. Безумоўна, гэта зніжала якасць унутрывантробнага развіцця плода і прыводзіла да зніжэння здароўя дзіцяці.

Спецыялісты адзначаюць, што асноўнымі ўскладненнямі падчас родаў з’яўляюцца хваробы мочапалавой сістэмы, анеміі, хваробы сістэмы кровазвароту, дысфункцыя шчытападобнай залозы. Але галоўная паталогія, якая ўскладняе працяканне цяжарнасці, — пагроза яе перапынення. У цяперашні час каля адной чвэрці цяжарных жанчын маюць прыкметы пагрозы спынення цяжарнасці.

Ігар ЗАЛЕСКІ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
11 ВЕРАСНЯ 2012 г.

РЭПАРТАЖ

Ля параднага пад'езда...

Другі пад'езд дома №43 па вуліцы Кахоўскай прызнаны лепшым у Мінску. Лепшы — гэта ўзорны, нечым адметны, а значыць, варты таго, каб жыхары астатніх гарадоў і весяў пра яго ведалі. І не проста ведалі, а маталі, як кажуць, на вус: пераймалі вопыт не адно ў сталіцы, але і па ўсёй краіне. Канечне, уведаўшы пра ўзорны пад'езд (ды яшчэ ў Дзень горада), неадкладна спяшаюся туды...



Кахоўская, калі хто не ведае, лічы, у ціхім цэнтры Мінска: побач з паркам Дружбы народаў, і да Камароўкі — рукой падаць... Раён добра мне знаёмы, бо ў 80-х якраз тут жыў... І вось яна — Кахоўская з цэлым кварталам "хрушчовак"... Цяпер тыя "хрушчобы" ніякія не "хрушчобы" — і гэта першае прыемнае ўражанне. Некалі шэрыя, як зямля, пяціпавярховікі не пазнаць: лашчаць вока вясёлымі фарбамі фасады, каляровыя балкончыкі, дахоўкі; у дварах, абапал пад'ездаў і прысад — акуратна вымашчаныя тратуарчыкі; апаясаныя дэкаратыўнымі (на манер вясковых) плоцікамі кветнікі. Словам, язык не павернецца кінуць нядобрае ў бок Мікіты Сяргеевіча... Але вернемся да нашага, так бы мовіць, параднага пад'езда. Чым адметны, наколькі спраўджвае свой ганаровы статус? І хто "вінаваты" ў ягонай цяперашняй прыгажосці, калі гэтак уразіў экспертаў?.. Паколькі ўваходныя дзверы на кодавым замку, то мусіў мець справу з першай жывой істотай, якая трапілася на вочы і якая — па ўсім — пражывае якраз у другім пад'ездзе. Той істотай аказаўся (і азваўся) бурштынава-плямісты кот, які імгненна падсеў да мяне на лаўку і замурлыкаў сваё. У перакладзе пачулася так: я кот Дымок, я тут жыву; цябе, двуногі галубок, у сваю хату не пушчу... Пацёршыся ля ног і не згледзеўшы ў чужынцы ворага, новаяўлены Леапольд падаўся ў кветнік, каб зноўку ўлегчыся пад драўляным сланом і далей прымаць сонечныя ванны...

— Камендант двара, — пачулася раптам за спінай, — жыве ў першым пад'ездзе, гуляе сам па сабе і прыгледжвае за ўсім падворкам.

Сталага веку чалавек, згледзеўшы маю фотакамеру, адразу скеміў, хто перад ім.


— Тут ужо былі карэспандэнты, — кажа, — чамусьці ўпадабалі менавіта наш пад'езд, як быццам астатнія горшыя...

— Значыцца, жывяце тут? — пытаюся ў сваю чаргу.

— Так і ёсць, у 29-й кватэры. Завуць Ігарам Вячаслававічам. Дык што вас цікавіць?

— Пад'езд, канечне. Хочацца на свае вочы пабачыць, а то на свой абрыдла пазіраць: замызганы, счарнелы... Кажуць, ваш — ні ў якое параўнанне з тысячамі астатніх...

Перакінуўшыся словамі пра набіўшую аскому праблему, заходзім у другі пад'езд. Сапраўды, чысціня і парадак: ніводнага акурка, ніводнага пісяга на сценах, светла, утульна. Падымаемся на другі паверх, трэці — тая ж



карціна. На кожнай лесвічнай пляцоўцы — адмыслова распісаныя карціны, на падаконніках — бялюткія фіранкі, кветкі...

— Калі ўдумацца, — кажа раптам Ігар Вячаслававіч, — то дзівіцца як быццам няма чаму. Нават не разумею, чаму наш пад'езд прызнаны лепшым, усё ж проста і сціпла... Ну чыста, ну не заплявана... Але ж хіба гэта дасягненне? Хутчэй норма...

— Вашаму дому пераваліла за паўсотню гадоў, няўжо так было заўсёды? — пытаюся.

І тут мой суправаджаты крышку сумеўся...

— Было, як і паўсюль, — кажа, — да той пары, пакуль не зрабілі капітальны рамонт. А далей людзі крышку схамянуліся, як быццам зразумелі, што далей так жыць нельга. А чаму? Светлыя фасады, ўцепленыя сцены, сучасныя вокны, новыя ацяпляльныя батарэі — і ўсё заіграла, перастала мазоліць вочы. Канечне, не варта думаць, што ўсё — дарунак дзяржавы. Мы ж дзесяцігоддзямі адлічвалі на той капрамонт свае грошы. Цяпер не тое, што раней, — хочацца жыць па-сучаснаму. Іншая справа, што насельнікі вось такіх "хрушчовак" — людзі рознага сацыяльнага статусу. Адны ашчадна ставяцца да агульнай маёмасці, іншыя — як Бог на душу пакладзе... У нашым доме 80 кватэр, людзі ў асноўным ведаюць адзін аднаго. Магчыма, таму і стараюцца жыць па-людску...

Да размовы далучылася Станіслава Іванаўна Запуняка, яна якраз выходзіла са сваёй аднапакаёўкі.

— У нас парадак, — кажа, — не толькі ў пад'ездзе, але і ў двары, пад вокнамі і нават далей... Бачылі, якія прыгожыя кветнікі?! А гэта ж усё стараннямі жонкі Ігара Вячаслававіча Галіны Яфімаўны ды яе сяброўак, усіх нас. Гледзячы на тое, астатнія таксама шавеляцца: галоўнае — праявіць ініцыятыву... У нас, па вялікім рахунку, дэфіцыт якраз грамадзянскай ініцыятывы. Ва ўсім... Некаторыя толькі і здатныя бурчэць: тое не так, гэта не гэтак, вінавацяць адзін аднаго. А па-мойму — варта не бурчэць, а пачаць з самога сябе, хаця б з малога: тады і ў грамадстве нешта путнае ды талковае атрымаецца...

У цяперашнім Мінску элітныя дамы растуць, як грыбы ў лесе, — з кансьержамі, з падземнымі гаражамі, розным электронным начыннем і ўсім астатнім. Але ж і стары жыллёвы фонд не выкінеш на сметнік. Значыцца, трэба яго прыводзіць у належны стан, гэтак, як зрабілі з кварталам "хрушчовак" па Кахоўскай. І тады пад'езды перастануць быць адстойнікамі бруду, і людзі пачнуць ставіцца да нармальнага — як да нормы, а не як да выключэння з агіднага правіла.



Георгій ЧЫГІР.
Фота аўтара.

Мінчане года

У мінулыя выхадныя Мінск адзначаў Дзень горада. Напярэдадні святаў было вызначана, хто ж будзе ўганараваны званнем "Мінчанін года".

У галіне прамысловасці ганаровае званне прысвоена намесніку дырэктара навукова-тэхнічнага цэнтра па новых распрацоўках ААТ "Мінскі аўтамабільны завод" — кіруючая кампанія холдынга "БелаўтаМАЗ" **Віктару Лакатко**.

У галіне транспарту і сувязі — галоўнаму штурману авіяцыйнага атрада ААТ "Авіякампанія Трансавіяэкспарт" **Сяргею Кузьменку**.

У галіне будаўніцтва — начальніку ўчастка спецыялізаванага будаўнічага ўпраўлення №1 дзяржаўнага прадпрыемства "Упраўленне дарожна-маставога будаўніцтва і добраўпарадкавання Мінгарвыканкама" **Уладзіміру Аўтуховічу**.

У галіне жыллёва-камунальнай гаспадаркі — кіраўніку службы па добраўпарадкаванні і ўтрыманні аб'ектаў зялёнай гаспадаркі ВКУП "Мінскзеленбуд" **Анжаліцы Пузанковай**.

У галіне аховы здароўя — галоўнаму ўрачу ўстановы аховы здароўя "Гарадскі клінічны радзільны дом №2" **Наталлі Курэк**.

У галіне вышэйшай адукацыі і навукі — дэкану архітэктурнага факультэта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта **Армену Сардараву**.

У галіне сярэдняй адукацыі — загадчыцы дзяржаўнай установы адукацыі "Санаторныя яслі-сад №118 г.Мінска" **Валянціне Мардыкінай**.

У галіне культуры — члену ГА "Беларускі саюз мастакоў" **Канстанціну Селіханаву**.

У галіне фізічнай культуры, спорту і турызму — члену нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па тэнісе **Вікторыі Азаранка.**

У сферы сацыяльнай абароны насельніцтва — дырэктару дзяржаўнай установы "Псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў №3 г.Мінска" **Анатолю Варэніку**.

У сферы гандлю і грамадскага харчавання — дырэктару гандлёва-вытворчага таварыства з абмежаванай адказнасцю "Брэст" **Дзмітрыю Валадзько**.

У сферы бытавога абслугоўвання — дырэктару комплексу грамадскага харчавання гасцінічна-сэрвіснага КУП "Бізнес-цэнтр "Сталіца "**Андрэю Сінякову**.

У праваахоўнай сферы, органах і падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях, мытных органах, сілавых структурах — пажарнаму пажарнай аварыйна-выратавальнай часці №28 Ленінскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях установы "Мінскае гарадское ўпраўленне Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь" **Антону Тарасевічу**.

Да ведама

Званне "Мінчанін года" прысвойваецца з 2002 года. Лаўрэаты атрымліваюць дыпломы і грашовую ўзнагароду ў памеры 25 базавых велічынь. Урачыстая цырымонія ўзнагароджання апошнімі гадамі праходзіць у Мінскай гарадской ратушы.

БПЦ хоча кананізаваць унучку Пушкіна

Камісія па кананізацыі святых Бабруйскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы вырашыла скласці жыццяпіс графіні Наталлі Варанцовай-Вельямінавай — унучкі расійскага паэта Аляксандра Пушкіна. Пра гэта паведамляе інфармацыйнае агенцтва БЕЛТА са спасылкай на Бабруйскую епархію.

У будучыні чакаецца кананізацыя ўнучкі паэта.

У епархіі паведамілі, што ў бягучым годзе 3 снежня будзе адзначацца 100 гадоў з дня смерці графіні Варанцовай-Вельямінавай, якая была дачкой старэйшага сына паэта — таксама Аляксандра. Частку свайго жыцця яна пражыла недалёка ад Бабруйска. У вёсцы Цялуша Бабруйскага раёна да гэтага часу захаваўся Свята-Нікольскі храм, які быў пабудаваны на яе сродкі. Менавіта каля яго алтара яна і была пахавана. У той жа вёсцы ў канцы XIX стагоддзя графіня заснавала школу для дзяцей сялян, са сцен якой выйшла некалькі святароў. Вядома таксама, што Варанцова-Вельямінава адкрыла разам з мужам у сваім маёнтку бібліятэку.

ВІНШУЕМ!

Уладзімір СОДАЛЬ:

«Мне Бог вельмі спрыяе...»

Уладзімір Содаль— пісьменнік,літаратуразнаўца, руплівы даследчык спадчыны Ф.Багушэвіча і В.Дуніна-Марцінкевіча, аўтар кніг "Жупранская старонка","Святы той куточак фальварак Свіраны", "Волат з Мігаўкі" і іншых— 13 верасня святкуе 75-гадовы юбілей. Жыццё пісьменніка было поўным складаных выпрабаванняў, незвычайных і цікавых падарожжаў, руплівай працы, шчырых сяброўскіх стасункаў.



Пісьменнік за рабочым сталом.

— Уладзімір Ілліч, за 75 гадоў ці ўсё здзейснілі, што хацелі?

— Тое, што мною зроблена, заўсёды нашай беларускай грамадзе спатрэбіцца. І гэта найперш усё тое, што мне ўдалося здабыць, расшукаць з Багушэвічавай спадчыны, з яго Кушлянаў. Гэта навечна. Ужо не адзін год мне рупіць распавесці нашым чытачам пра Андрэя Снітку і ягоны фальварак Карлсберг. Мне выпала знацца з яго дачкой Верай, слухаць яе расповеды пра бацьку, пра іхні фальварак. Гэта яшчэ адна найцікавейшая старонка нашага духоўнага жыцця. Я апрача нашых шматлікіх сустрэч ліставаўся з Верай Андрэеўнай. А напісанае ёй — гэта непаўторныя старонкі нашай гісторыі. Да ўсяго Веры Андрэеўне выпала стацца жонкай Браніслава Тарашкевіча.

А гэта зноў жа наша гісторыя, ды яшчэ якая! Цяпер рыхтую матэрыялы да Купалавага юбілею, публікацыі ў часопісе "Дзеяслоў".

— Што вам яшчэ важна занатаваць?

— Я хацеў бы хапісаць тое, што датычылася маіх продкаў. Землякі прапанавалі мне напісаць гісторыю вёскі Мормаль. Аднойчы ў друку я знайшоў такі выраз: "*у Мормальскіх лясах, у Францыі".* Магчыма, быў нейкі француз, які затрымаўся пасля паходу 1812 года на Беларусі, і ад яго магла застацца і пайсці далей назва вёскі.

Пакрысе я сабраў свой радавод. Працую над кніжачкай пад назвай "Адкуль на Беларусі пайшлі Содалі".

Да вайны на вуліцы мяне, маленькага, дзеці цвялілі: "Содаль, Содаль, дай соды!" З тае пары мяне заінтрыгавала маё прозвішча...

— І што вы даведаліся пра жыццё сваіх продкаў?

— У дзеда Паўла былі тры сыны і пяць дачок. Ён леснікаваў, за невялічкі капітал, які здабыў сваёй працай, ён пабудаваў паравы млын, дзе гаспадарыў. У 30-я гады сям'ю раскулачылі, млын канфіскавалі, тату яшчэ хлопцам саслалі ў Сібір. Але без свайго спецыяліста млын ніхто не мог ізноў запусціць.

Тату Іллю, які быў механікам, вярнулі з ссылкі. Ён быў худы, знясілены. Яго накіравалі на ферму і выпісалі яму малачка, каб падмацаваўся. Матулька мая была даяркай, карміла тату малачком. Пасля ён пабудаваўся, стварылася сям'я. Цётачкі і бабулька расказвалі мне пра мінулае. Мама была з 1919 года, яна пражыла больш за 90 гадоў.

"Содалі паходзяць з Прыбалтыкі", — тлумачыла сястра. Яна падзялілася сямейным паданнем: Гомельскі князь Паскевіч аднойчы напаткаў нашага прапрадзеда, упадабаў яго і забраў да сябе ў Гомель. Дзед паступіў на службу садоўнікам князя і хадзіў на паляванне разам з усім гуртом. Не адно дрэва было вырашчана ў парку Паскевічаў з дапамогай прадзеда Содаля.

Прадзед меў агромністую фізічную сілу, так, што барукаўся з мядзведзем і перамагаў! Здаралася прыкладна так: паляўнічыя акружалі бярлогу звера загадзя. Вокрыкамі і шумам яны будзілі яго. Не ў час патрывожаны, раз'юшаны звер падымаўся на чалавека.

Чалавек моцна браў мядзведзя за пярэднія лапы, і яны некаторы час тузаліся. Гэта пацяшала князя і яго гасцей, у той жа момант некалькі паляўнічых стаялі паводдаль з рагацінамі і стрэльбамі напагатове.

Аднойчы дзеду Несцеру не пашанцавала. Гурт выпадкова раскатурхаў і выгнаў з бярлогі цяжарную мядзведзіцу. Раз'ятраная звярына вырвала ў чалавека кавалак шчакі са сківіцай. Так ён і жыў са шрамам да канца жыцця. Князь Паскевіч сам вазіў прадзеда лячыцца ў Францыю, дзе яму нарошчвалі кавалак цела, выразаны з ягадзіцы. У новай кніжцы я пра гэта распавяду.

— **Вашыя равеснікі — дзеці і сведкі вайны.**

— Мы сапраўды апошнія сведкі, якія памятаюць вайну. Калі я кажу па тэлефоне: "Гаворыць 1937 год!" — у маім голасе людзі чуюць трывожную інтанацыю, за тыя часы, што былі ў 1930-я гады на Беларусі.

Хрысцілі мяне родныя патаемна ў 1937 годзе, у прыцемках. Нават свечку не запальвалі. Святар сказаў маме: "Ваш хлопчык будзе звацца Ладымерам!" "Хоць бы Валодзька быў", — троху запярэчыла матулька. "Дык гэта ж ён і ёсць!"

Уладзімір Ілліч — гэта імя мяне трымала па жыцці. Мне не дазвалялі свавольстваў, што былі даступныя іншым дзецям.

Я часам распытваў матульку пра некаторыя свае ўспаміны: "Мама, ці такое было?" "Так, так, было. Валодзечка, а ты памятаеш, як цябе немцы забіралі?" — "Не, мама, няўжо гэта было?"

Потым я прачытаў у перыёдыцы: у тых мясцінах знаходзіўся нямецкі шпіталь, у якім немцы бралі ў дзяцей кроў. Петрык-староста абараніў мяне, не даў немцам забраць.

Тата загінуў у першыя дні вайны, ён крыху недачуваў, і яму надзвычай цяжка было ў баі.

З Мормаля немцы перагналі бежанцаў у свой тыл. Мы з матуляй жылі некаторы час пад Бабруйскам.

У 1944 годзе спяшаліся: хутчэй бы толькі вярнуцца дадому!

"Асцярожна! Міны!" — відзнеліся надпісы паўсюль. Усё наваколле зарасло травой, быльнягом. Міны. Выбухі. Людзі на выбух беглі на поле паглядзець: хоць бы не мае патрапілі!

Танкавыя баі ішлі каля Мормаля. Столькі было падарвана тэхнікі! Потым, у 1944-м, у кожнага хлопчыка быў танк, на гарматы мы залазілі і каталіся. Стаялі спаленыя танкі, костачкі з іх асцярожна вымалі і закопвалі.

Аднойчы мы з сябрам гуляліся з патронамі. Калупаў суседскі хлопчык, патрон выбухнуў... Яму абарвала пальцы, а мне асколак патрапіў у вока. Трашчала галава, мучыў моцны боль.

Праз гады доктар Фёдараў у Маскве падрабязна распытаў мяне пра здарэнне. "На жаль, мы вам не можам дапамагчы, прыйдзецца развітацца з вокам".

Пасля зрабілі пратэз. Другое вока перанапружваецца занадта. Пісаць магу, а чытаць складана. Унук трошкі дапамагае набіраць на камп'ютары. Так я застаўся інвалідам па зроку. У "Полымі" ў мяне была дакументальная аповесць "Вайна пасля вайны".

Пасля школы ў 1956—1957 гадах я працаваў у Мурманску на суднарамонтным заводзе. Адтуль прыслаў свае дакументы ў інстытут у Мінск. Заяву на паступленне напісаў па-беларуску. Накіраваў ліст Нілу Гілевічу, ён тады быў аспірантам. Той ліст ён захаваў на доўгія гады. Сотня пытанняў у ім была...

— Уладзя, у табе нешта ёсць! — казаў потым Ніл Гілевіч.

Прыйшлі дакументы ў інстытут. Старшынёй камісіі быў загадчык кафедры, вядомы філолаг і аўтар падручнікаў Фёдар Янкоўскі. Ён разгарнуў маю заяву, прачытаў і сказаў: "Во гэтага хлопца трэба ўзяць і вывучыць! Калі будуць памылкі — паправіць!" Пра тое потым распавёў мне сакратар камісіі.

— Уладзімір Ілліч, а як вам давялося сустрэць сваю верную сяброўку жыцця Клару Барысаўну?

— Аднойчы татава сястра сказала паўжартам: "Валодзечка! Чаму ў цябе няма памочніцы? Ты б ажаніўся: яна б працавала, а ты — вучыўся б".

— Я была на 3-м курсе, — **уступае ў размову Клара Барысаўна**. — Вучылася на тэхнолага і працавала ў аддзеле эканомікі абутку, жыла на кватэры ў гаспадыні. Мы з сяброўкай гулялі ў парку імя Горкага, і да нас падышлі двое хлопцаў. Так мы пазнаёміліся. Валодзя жыў у студэнцкім інтэрнаце.

Нас было ў мамы чатыры дачкі. Бацька Барыс Караткевіч працаваў у райкаме і быў занадта адданы партыйнай справе. Ён чакаў сына, а нараджаліся дачушкі. Іх назвалі: Роза, Клара і Святлана. Вельмі хацелі сына — Валодзю. Але перад вайной нарадзілася чацвёртая дзяўчынка. "Гэта будзе ў нас Сталіна!" — кажа тата. (Потым яна змяніла імя на Галіна.) Шкада, не дажыў тата да таго, калі я прывяла ў дом Уладзіміра Ілліча!

Калі нас эвакуіравалі, мама з чатырма малымі на руках рухалася. Малодшую ў падол загортвала. Тата быў на фронце, мы былі ў эвакуацыі ў Саратаве да 1954 года. (Там раслі гарбузы здаравенныя, мясістыя, мы прывыклі іх парыць і есці.) У 1953 годзе мы расшукалі родных і вярнуліся на Беларусь, людзі набылі нам халупачку, так і жылі, пакуль усе сёстры не павыходзілі замуж.

Доўгі час мы з Валодзем сустракаліся, потым узялі шлюб. Гаспадыня, цёця Лёня, зладзіла вячэру маладым. Першую ноч усе разам з гасцямі спалі на падлозе. Сёння мы гулялі вяселле, а назаўтра выпаў снег, было ўсё белае. Гэта адбылося 1 мая 1961 года.

Потым мы пераехалі ў Астрашыцкі Гарадок. Уладзімір Ілліч пайшоў працаваць у дзіцячы туберкулёзны санаторый у Астрашыцкім Гарадку. Чулы настаўнік у белым халаце выкладаў дзецям беларускую мову. З часам мы пераехалі ў кватэру на вул.Шчадрына ў Мінску.У 1977 годдзе пабудавалі новы 16-павярховы будынак каля праспекта Скарыны —Незалежнасці, дзе мы жывём зараз. Старэйшы наш сын Марат нарадзіўся ў Астрашыцкім Гарадку, дачушка Аксана — у Мінску. Выраслі ўнукі — Кастусь, Алесь, Сяржук і Максім.

— Якія падзеі апошняга часу сталі самымі радаснымі для вас?

— Мы прычакалі першага праўнука, — **з гонарам кажа Уладзімір Содаль.** — Мае ўнукі назвалі яго Дамінікам. У свой час, у свае маладыя гады, я браў Дамінікавага тату ўсюды, асабліва калі вандравалі па Купалавых мясцінах. Мо гэтыя вандроўкі нейкім чынам адгукнуліся ў Кастусёвай душы, таму і назваў ён сына Дамінікам. Дамінік Содаль — пагадзіцеся, гучыць арыстакратычна, каларытна, самабытна. Мы яго васьмімесячнага сфатаграфавалі з фотаздымкам Дамініка Луцэвіча, таты Янкі Купалы. Балазе я калісь працаваў на тэлебачанні і прыхаваў згаданы фотаздымак, быццам прадчуваў, што Бог пашле нам Дамініка.

Уся наша сям'я з гонарам прыняла імя новага члена сям'і, прадаўжальніка роду Содаляў. Мой унук Сяржук Чылікін-Садэльскі, аўтар трох кніжачак, адгукнуўся вершам. І я напісаў у сваім радаводзе ўжо некалькі слоў пра праўнучка.

Увогуле, мне Бог вельмі спрыяе. Пасылае паўсядзённыя сустрэчы, патрэбных людзей...

Уладзімір Ілліч і Клара Барысаўна Содаль.

Эла ОЛІНА.
Фота К.Гарэцкага.

СІТУАЦЫЯ

Уцёкі на Захад

Паміж Беларуссю і Літвой чарговая канфліктная сітуацыя. Беларускі бок дабіваецца выдачы дэзерціра, былога вайсковага разведчыка, які ўцёк з вайсковай часці. Вільнюс не спяшаецца з экстрадыцыяй...

Гісторыі гэтай больш за год. 27 ліпеня 2011 года ваеннаслужачы тэрміновай службы Сцяпан Захарчанка самавольна пакінуў адну з часцей Мінскага гарнізона. Паводле інфармацыі прэс-службы Міністэрства абароны Беларусі, па гэтым факце была распачата крымінальная справа. Падчас вывучэння акалічнасцяў учынення злачынства, згодна з афіцыйнай інфармацыяй, было ўстаноўлена, што Захарчанка характарызаваўся вельмі негатыўна. Яшчэ да прызыву ў армію неаднаразова прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці, у тым ліку за хуліганства і распіванне спіртных напояў у грамадскім месцы. Сваімі калегамі, па той жа інфармацыі, Захарчанка характарызуецца як "гультаяваты, хітры і вёрткі чалавек, схільны да падману і парушэння дысцыпліны, які ўвесь час шукае асабістую выгаду і канфліктуе з тымі, хто яго акружае".

Сам Сцяпан Захарчанка называе іншыя прычыны сваіх уцёкаў. "Апошняй кропляй, якая перапоўніла маё цярпенне і падштурхнула мяне пакінуць часць і бегчы ў Літву, гэта сход сяржанцкага саставу. Сяржантаў батальёна разведкі сабралі, і зампаліт раздаў нам паперу, у якой было напісана, што ў выпадку, калі сілы МУС не будуць спраўляцца з масавымі пратэстамі з боку насельніцтва, то мы бяром на сябе абавязацельства выканаць любы загад прэзідэнта і адкрыць агонь па грамадзянах краіны, якія пагражаюць канстытуцыйнаму ладу Беларусі. Штосьці такое было напісана, даслоўна цяпер цяжка прыгадаць", — сказаў Сцяпан Захарчанка сайту "Беларускі партызан".

Зразумела, што ў падобных выпадках інфармацыію трэба дзяліць на два і на тры, бо кожны з бакоў даводзіць да грамадскасці свае довады так, як лічыць найбольш выгадным для сябе. Але фактам застаецца тое, што былы вайсковы разведчык здолеў незаўважаным перайсці беларуска-літоўскую мяжу і зараз знаходзіцца ў Літве.

АФІЦЫЙНА

Літва не будзе спяшацца з выдачай ваеннаслужачага Сцяпана Захарчанкі, які збег з Беларусі ў 2011 годзе. Пра гэта, як паведамляе агенцтва BNS, заявіў журналістам міністр унутраных спраў Літвы Артурас Мялянас.

Ён адзначыў, што цяпер Захарчанка знаходзіцца ў Цэнтры рэгістрацыі замежных грамадзян, і паабяцаў пацікавіцца, чаму беларусу не быў дадзены прытулак.

"Паводле маіх даных, рашэнне адмовіць у прыстанішчы было абскарджана ў судзе, — так што, я думаю, павінна быць пройдзена нармальная прававая працэдура. Але ў гэтым выпадку мы ні ў якім разе не будзем спяшацца з экстрадыцыяй гэтага чалавека ў Беларусь", — сказаў ён.

КРЫМІНАЛ

Кілер аказаўся беларусам

Расійскімі следчымі органамі ўстаноўлены асобы, якія маюць дачыненне да заказнога забойства вядомага трэнера Юрыя Шышлова. Як аказалася, выканаўцам быў грамадзянін Беларусі.

Як паведамляе прэс-служба Следчага камітэта Расіі, абвінавачанне ў здзяйсненні злачынства, прадугледжанага ч.3 КК РФ (арганізацыя забойства па найме) прад'яўлена раней судзімай за махлярства 30-гадовай уладальніцы кампаніі "Імперыял" Карыне Абезавай.

Напад на Юрыя Шышлова быў здзейснены 4 жніўня 2010 года: кілер стрэліў яму ў патыліцу з газавага пісталета з глушыцелем, пераробленага пад стральбу баявымі патронамі. На наступны дзень трэнер памёр у бальніцы.

Аператыўнікі прагледзелі запісы камер назірання ў раёне здарэння і знайшлі аўтамабіль Volkswagen, які падвозіў забойцу. Было ўстаноўлена, што машына належыць 31-гадоваму грамадзяніну Беларусі Сяргею Бялову, які ў Маскве займаўся прыватным возніцтвам. У паліцыі ён распавёў, што ў той дзень падвозіў свайго земляка — 33-гадовага Андрэя Ярцава. Па словах таксіста, ён не ведаў аб намерах Ярцава. Магчымага забойцу абвясцілі ў вышук, але затрымалі толькі 23 сакавіка гэтага года на вакзале ў Санкт-Пецярбургу, калі ён купіў білет да Мінска.

Пры правядзенні следчых дзеянняў Ярцаў прызнаўся ў заказным забойстве. Паводле яго слоў, менавіта Сяргей Бялоў прапанаваў яму забіць Юрыя Шышлова за 100 тысяч рублёў. Сам жа Бялоў за сваю ролю памочніка выканаўцы атрымаў ад Карыны Абезавай 50 тысяч рублёў.

Па версіі следства, бізнеследзі зрабіла беларусам "заказ" на забойства з мэтай пазбегнуць выканання даўгавых абавязацельстваў, бо была павінна Шышлову буйную суму грошай. Сяргей Бялоў зараз аб'яўлены ў вышук.

КОМПЕТЕНТНО

Александр РУДСКИХ:

«Аресты на провал белорусских легкоатлетов не повлияли...»



Об итогах Олимпиады, о том, в какой яме оказалась белорусская “королева спорта”, корреспондент “Народной Воли” беседует с бывшим главным тренером и председателем Федерации легкой атлетики Беларуси, заслуженным тренером СССР ***Александром РУДСКИХ****.*

На днях министр спорта высказался о выступлении белорусских легкоатлетов на Олимпиаде в Лондоне так: “Провалились в легкой атлетике. Допинговые инциденты, отсутствие главного тренера и его помощника по медицине. Многие спортсмены из-за неготовности отказались от участия в Играх. Министерство финансировало подготовку в полном объеме. Кто теперь вернет эти средства государству? Некоторые спортсмены сознательно показывали плохой результат. Причины устанавливаются... Что произошло в легкой атлетике? Кто за это ответит? Вы ответьте за тот результат, за те деньги, которые государство вложило. Огромные деньги... Как же получается, что все были готовы, 15 человек готовили на медали, а в итоге одна Остапчук взяла медаль? И ту отобрали”.



Так что же происходит с белорусской легкой атлетикой на самом деле?

— Этот вид спорта сейчас деградировал, — отмечает Александр Григорьевич РУДСКИХ. — Об этом и раньше говорилось, что называется, били во все колокола, но публикации воспринимались как какие-то кляузы обиженных людей. При этом распространялись не сплетни, а мы приводили цифры, диаграммы... И не надо было иметь много ума, чтобы задуматься над этими вопросами. А сейчас уже спохватились. Вдруг прозрели и увидели, что имеем.

— В чем, на ваш взгляд, основная проблема белорусской легкой атлетики?

— Я хочу сказать, что сегодня спорт вышел на такую высоту, что одному тренеру с громадным опытом и великолепной интуицией уже не под силу проследить за развитием спортсмена. Нужны научные и медицинские параметры, которые бы подсказывали, что спортсмен растет, а не наоборот — движется по неправильному пути. Во всем мире такие системы управления созданы. Мы тоже имеем Центр спортивной медицины, но что там получаем? Ничего. Я в свое время, работая в экспертном совете, пытался поставить дело на нужный лад, но не получил поддержки и понял, что бороться с ветряными мельницами не стоит. Написал заявление и ушел по собственному желанию.

— Директор Республиканского центра олимпийской подготовки по легкой атлетике Геннадий Алексеенко считает, что основная причина неудач — это арест накануне Олимпиады главного тренера сборной по легкой атлетике Анатолия Бадуева и главного врача команды...

— Так в легкой атлетике есть же еще три врача! И, кажется, столько же массажистов. Я думаю, что никакие аресты ни на что не повлияли. Ведь та ситуация, в которой сегодня оказался этот вид спорта, была создана именно Бадуевым. Он подавил всех и никого не слушал. Он меня сделал персоной нон грата. За что? Я вообще удивляюсь талантам бывшего главного тренера. У нас руководитель федерации Владимир Потупчик — со статусом государственного человека, но получалось, что все основные вопросы все равно решал тренер. И, когда я на последней отчетно-выборной конференции сказал, что Бадуев не может быть заместителем председателя федерации, Потупчик снова его выдвинул. Всего два человека проголосовали против. Зачем нам тогда такая федерация и такие государственные деятели? Чем они занимались? Я вот этого не понимаю.

— Кстати, Анатолий Бадуев по-прежнему остается за решеткой, идет следствие. Вам ничего не известно по этому делу?

— А я не хочу прикасаться к этому грязному делу. Потому что требовать деньги со своих тренеров и спортсменов — это самая настоящая низость.

— Тот же Алексеенко заявил, что “вся надежда в наше время — на хорошую таблетку”. Отмечалось, что мы проиграли эту Олимпиаду методически и фармакологически. Мол, “россияне и немцы заходят в кабинку, делают, что им нужно, и идут метать молот. А то, на чем готовились мы, — это 1979 год”.

— Ну, конечно, применяют препараты, которые можно обнаружить через 90—100 дней. Это сколько же нужно прятаться от допинг-контроля?

— Но речь, насколько я понял, идет о разрешенной фармакологии...

— Безусловно, без фармакологии не обойтись. Нужно восстанавливать спортсмена, добавлять ему силы. Но фармакология должна накладываться на соответствующий уровень подготовки человека. Вот тогда будет эффект. На одной фармакологии далеко никуда не уедешь. Потому что, если спортсмен не готов, ему можно дать любые разрешенные или запрещенные препараты, но он все равно не победит на современном уровне. Фармакология прежде всего должна способствовать восстановлению, накоплению каких-то микроэлементов. А мы серьезно этим делом не занимаемся. В нашем современном спорте я не вижу специалистов по фармакологии того уровня, который сегодня требуется. Я готов об этом заявить на любом уровне.

— Специалисты утверждают, что белорусской легкой атлетике нужно 2—3 года, чтобы выбраться из ямы. Это так?

— Из нового поколения, кроме Алины Талай, которая выступает на дистанции 100 метров с барьерами, я больших перспектив у наших спортсменов не вижу. Да и Алине пока не стоит петь дифирамбы. Чтобы она реально могла бороться на следующей Олимпиаде за медали, ей еще нужно проделать огромную работу.

— Еще до конца не расследовано дело Надежды Остапчук, которую обвинили в применении допинга. Чем оно может закончиться?

— У меня нет никаких новых данных по этому делу, а есть только собственный взгляд на ситуацию. А она такова, что еще 30 июля Надя сдавала анализы на международный контроль в Кельнской лаборатории и проба была отрицательной, а уже допинг-тест, который был сдан спортсменкой 4 августа, оказался положительным. Принимать что-то спортсмену прямо перед стартом — это надо быть, извините, полным идиотом. А если была какая-то диверсия... Возможно, расследование расставит точки над “і”.

Алесь СВЕТЛАНИЧ.

За крок да перамогі...

Беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка ўпусціла перамогу ў фінале адкрытага чэмпіянату ЗША — заключнага ў сезоне турніру “Вялікага шлема”.

У ноч на 10 верасня першая ракетка свету саступіла амерыканцы Серэне Уільямс — 2:6, 6:2, 5:7. У трэцім сэце Азаранка вяла 5:3 пасля брэйк-пойнта.

Агульны лік асабістых сустрэч стаў 10:1 на карысць Уільямс.

За прафесійную кар’еру Азаранка 23 разы выступала ў фіналах турніраў ВТА, 12 з якіх яна выйграла. У фінал US Open яна выйшла ўпершыню.

«Народная Воля»

в Twitter
www.twitter.com/narodnaya_volya

в Facebook
www.facebook.com/nv.online.info

в Vkontakte
www.vk.com/nvonlineinfo

МАЗАІКА

У Мінск прыедзе «Барселона»

Гандбалісты мінскага “Дынама” выйшлі ў групавы раўнд Лігі чэмпіёнаў.

У кваліфікацыйных матчах супраць турэцкага “Бешыкташа”, якія паводле ўзаемнай дамоўленасці прайшлі 8 і 9 верасня ў мінскім Палацы спорту, беларуская каманда атрымала дзве перамогі — 30:22 і 31:24.

“Дынама” выступіць у групе D Лігі чэмпіёнаў разам з іспанскай “Барселонай”, харвацкім “Заграбам”, швейцарскім “Шафхаўзенам”, нямецкім “Фюксе” і венгерскім “Пікам”. Турнір пройдзе з 26 верасня па 24 лютага.

На шляху да Кубка Беларусі

Вызначыліся ўсе ўдзельнікі 1/8 фіналу Кубка Беларусі па футболе.

З-за пераносаў матчы 1/16 фіналу праводзіліся цягам больш як паўтара месяца — з 19 ліпеня па 9 верасня.

Вынікі: “Белтрансгаз” (Слонім) (Д3) — “Граніт” (Мікашэвічы) (Д2) — 4:1, “Смаргонь” (Д2) — “Нёман” (Гродна) — 1:3, ДСК (Гомель) (Д2) — “Бяроза-2010” (Д2) — 0:2, “Нёман” (Масты) (Д3) — “Брэст” — 1:7, “Віцебск” (Д2) — “Тарпеда-БелАЗ” (Жодзіна) — 1:2, “Іслач” (Д3) — “Мінск” — 0:3, “Слуцк” (Д2) — “Дняпро” (Магілёў) (Д2) — 1:2, “Хімік” (Светлагорск) (Д2) — “Гарадзея” (Д2) — 0:2, “Ліда” (Д2) — “Славія” (Мазыр) — 0:2, “Жлобін” (Д3) — “Белшына” — 0:2, “Зорка-БДУ” (Мінск) (Д3) — СКВІЧ (Мінск) (Д2) — 0:2, “Полацк” (Д2) — “Гомель” — 7:8 (асноўны час — 0:0, дадатковы — 1:1, пенальці — 6:7), “Ведрыч-97” (Рэчыца) (Д2) — “Дынама” (Мінск) — 0:1, “Хваля” (Пінск) (Д2) — “Нафтан” (Наваполацк) — 3:2 (асноўны і дадатковы час — 0:0, пенальці — 3:2), “Гомельчыгунтранс” (Д3) — “Шахцёр” (Салігорск) — 0:1, “Рудзенск” (Д2) — БАТЭ (Барысаў) — 0:4. Такім чынам, з каманд вышэйшай лігі не прайшоў далей толькі “Нафтан”.

Ведай нашых!

На летніх Паралімпійскіх гульнях у Лондане, якія завяршыліся 9 верасня, беларускія спартсмены заваявалі 10 медалёў: пяць залатых, два сярэбраныя і тры бронзавыя.

Шэсць узнагарод на рахунку 18-гадовага плыўца Ігара Бокія — пяць залатых (стометроўкі вольным стылем, батэрфляем і на спіне; 400 метраў вольным стылем; 200 метраў комплексным плаваннем) і сярэбраны (50 метраў вольным стылем).

Уладзімір Ізотаў быў другім на дыстанцыі 100 метраў брасам, Людміла Валчок была трэцяй у акадэмічным веславанні, Аляксандр Субота — трэцім у трайным скачку, Ганна Канюк — таксама трэцяй у скачках у даўжыню.

У медальным заліку Беларусь заняла 25-е месца. Першая дзясятка: Кітай (95, 71, 65), Расія (36, 38, 28), Вялікабрытанія (34, 43, 43), Украіна (32, 24, 28), Аўстралія (32, 23, 30), ЗША (31, 29, 38), Бразілія (21, 14, 8), Германія (18, 26, 22), Польшча (14, 13, 9), Галандыя (10, 10, 19), паведамляе БелаПАН.

ПО ПОВОДУ

Почему мы не можем воплотить наши олимпийские мечты?

Итоги выступления белорусов на Олимпиаде в Лондоне продолжают обсуждать, и это надо делать. Работа над ошибками — она еще никому не мешала...

Прежде всего считаю, что не только государственных наград, но и просто благодарности заслуживают все наши медалисты. Тех же благ должны удостоиться и их тренеры. Но сейчас нужно говорить не только о них, но и о тех видах спорта, в которых мы вообще не увидели олимпийских медалей. А таковых гораздо больше. И ситуация с каждым годом, увы, не улучшается. Чем же занимались весь олимпийский цикл “безмедальные” федерации и персонально их руководители? Не пора ли нести ответственность? Ведь деньги на подготовку тратились — и немалые. Поражает в этом вопросе и позиция руководителей Минспорта и туризма. Ведь с них тоже никто ответственности не снимал. И спрашивать надо так же серьезно, как и со всех остальных.

Очень грустно было наблюдать за выступлением белорусских легкоатлетов в Лондоне. Четыре года назад на Олимпиаде в Пекине в этом вида спорта у нас было шесть медалей — одна золотая, две серебряные и три бронзовые. Сейчас — пусто! Так в чем дело? Думаю, что наше легкоатлетическое хозяйство серьезно больно. Возможно, понадобится даже хирургическое вмешательство.

В боксе тоже уже вторая Олимпиада подряд не приносит медалей. Более того — сокращается количество белорусов, которые выступают на Играх. И снова повод для раздумий руководства федерации. Нет медалей в дзюдо, в мужской команде по тяжелой атлетике... Тяжелоатлеты, мол, травмировались перед соревнованиями. Господа специалисты, вы не знаете, что способствует травматизму в спорте? К слову, о травмах у наших спортсменов. Травмированной участвовала в олимпийских соревнованиях и наша замечательная представительница академической гребли Екатерина Карстен и по этой причине заняла только пятое место. Чем не повод задуматься о перспективах белорусской спортивной медицины?

И еще. Нам нужно понять, что большим спортом должны руководить не политики и чиновники, не бизнесмены, а профессионалы спорта. Первые должны просто помогать последним. У нас же все получается наоборот. Кроме того, если мы действительно хотим быть в двадцатке лучших спортивных держав мира, нам нужно серьезно улучшить спортивную базу. В-третьих, нужно перенимать опыт азиатских стран.

Вот тогда мы сможем воплотить в жизнь наши олимпийские мечты, которые, увы, пока что так и остаются лишь мечтами.

**Юрий ЯСИНСКИЙ,
ветеран спорта,
заслуженный тренер БССР.**

ШАШКІ

Памяці маэстра

Сёлета аматары старадаўняй гульні адзначаюць 75-годдзе з дня нараджэння выдатнага беларускага шашачнага кампазітара Гары Адамавіча Далідовіча. Найлепшы вынік па гэтым інтэлектуальным відзе спорту ён паказаў у першынстве Савецкага Саюза 1980 года: заваяваў залаты медаль у раздзеле стварэння задач-100 і атрымаў ганаровае званне “Майстар спорту СССР”.

Яшчэ Гары Адамавіч вядомы як суддзя ўсесаюзнай катэгорыі, сааўтар кнігі “Задачы-мініяцюры ў міжнародных шашках” (Мінск, “Полымя”, 1985 г.), старшыня Рэспубліканскай камісіі па шашачнай кампазіцыі, якая пад яго кіраўніцтвам рэгулярна праводзіла адпаведныя конкурсы і чэмпіянаты Беларусі. 11 гадоў вёў рубрыку “Шашкі” ў газеце “Мінская праўда”, руплівa збіраў задачы, якія змяшчаліся ў айчынным і замежным друку.

Беларуская федэрацыя шашак праводзіць зараз Міжнародны конкурс “Беларусь-2012”. У ім у гонар Г.А.Далідовіча прадугледжана катэгорыя А (задачы-100). А знакаміты праблеміст і калекцыянер Аляксандр Палявы (Ізраіль) светлай памяці маэстра прысвячае свае творы, першыя чатыры з якіх складзены сумесна з мінчанінам Мікалаем Грушэўскім :

1.**Белыя**: a7, b4, c3, c5, c7, дамка a1 (6). **Чорныя**: a3, a5, d8, e3, e7, f2, f4, g7 (8). З дапамогай задачнага прыёму запіраюцца дзве простыя чорных. Развяжыце самастойна.


2.**Белыя**: 22, 27, 32, 34, 36, 39, 40, 43, 44, 46, 50 (11). **Чорныя**: 9, 11, 16, 19, 20, 26, 35, 38, 45 (9). Выйгрыш: 17, 27, 21, 33, 3, 39, 45 (49A) 44, 34 (31) 41(36) 37x. A(23) 34, 34x.

3.**Белыя**: e1, e3, e7, g5, h6 (5). **Чорныя**: b2, b4, e5, f8, g7, h2, h8 (7). Перамога белых: f2, c1 (g1) b2!(f4) gf6!, c1, f8x.

4.**Белыя**: 31, 32, 34, 36, 39, 40, 43, 44, 50 (9). **Чорныя**: 8, 16, 18, 20, 22, 35, 45, дамка 38 (8). Дамачная праблема-100: 31-27 (31)27, 21, 33, 3, 39, 45x.

5.**Белыя**: b6, c7, d2, f4, f6, g1 (6). **Чорныя**: a5, b4, d8, e3, h4, h8 (6). Мініпраблема-64: 1. d2-c3 b4:d2 2. g1-h2 3. h2-g3 4. c7-b8 5. b8:f8x. 1-0.

6.**Белыя**: h2, дамка d6 (2). **Чорныя**: d8, f6, h4, h8 (4). Эцюд: 1. d6-b4 f6-e5 [1...d8-c7 2. b4-e1 f6-e5 (2...c7-b6 3. h2-g3 4. e1:a5x) 3. h2-g3 4. e1:b8x) 2. b4-c3 e5-f4 3. c3-d2 h4-g3 4. d2:h6 g3-f2 5. h2-g3 f2:h4 6. h6-f4x. 1-0.



Рашаем разам

“Багатая на таленты”: №1 (М.Крышталь). C3 (f2, f2) ed6, h8 (g1 A) d2, g3, e3, a1, a5+. A (g3, g1) e5, c5+.

Мікалай ГЛАДКІ.

Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а. Прыёмная: тэл. (017) 3286871. Тэл./факс рэкламнага аддзела: (017) 3286904, 3286906
nv@promedia.by
http://www.nv-online.info http://twitter.com/narodnaya_volya

ISSN 2071-9647



Падпісныя індэксы: 63222, 632222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 10.09.2012 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 28010 экз. Заказ №3983.